УДК 973.092«19/20»

І.В. Варывончык

# ПАЛІТЫКА КІРУЮЧЫХ АДМІНІСТРАЦЫЙ І ТЭНДЭНЦЫІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ ЗША (КАНЕЦ ХХ – ПАЧАТАК ХХІ ст.)

У другой палове 90-х гг. традыцыйныя паказчыкі эканамічнага развіцця сведчылі аб спрыяльнай сітуацыі ў эканоміцы ЗША. Эканоміка развівалася хутчэй, чым у любой іншай краіне Захаду, калі браць пад увагу рост валавага нацыянальнага прадукту і вытворчасці тавараў і паслуг на душу насельніцтва (табліца).

Упершыню за 25 гадоў рост прадукцыйнасці суправаджаўся ростам рэальных даходаў не толькі высокааплатных катэгорый работнікаў, але і работнікаў сярэдняга і нізкага ўзроўню аплаты. Шматгадовая тэндэнцыя стагнацыі даходаў сярэдняга класа была пераломлена. Прырост рэальнага сярэдняга даходу сям'і з 1947 па 1973 г. складаў 2,6% у год. Тэмпы росту даходаў зменшыліся да 0,4% у перыяд з 1973 па 1995 г. і павялічыліся да 2,1% у год у перыяд з 1995 па 2000 г. Найбольшых поспехаў дабіліся бедныя амерыканцы. Сярэдні ўзровень даходу афраамерыканскай сям'і дасягнуў гістарычнага максімуму ў 64% ад узроўню даходаў белай сям'і. У гэты перыяд раслі даходы сем'яў нацыянальных меншасцей. Сярэдні рэальны даход афра-амерыканцаў вырас на 17 %, іспанамоўных сем'яў – на 27% [2, с. 24]. Па даных Бюро статыстыкі, з 1996 па 2000 г. з 36,5 да 31,1 млн чалавек скарацілася колькасць амерыканцаў, якія мелі даходы ніжэй за мяжу беднасці. Да 3% знізілася доля працаваўшых, але не здолеўшых дасягнуць даходаў вышэй за ўзровень беднасці амерыканцаў [3, с. 27]. З 1994 г. пачаўся новы будаўнічы бум. З 1994 па 2003 г. працэнт сем'яў, якія мелі ўласныя дамы, вырас з 64 да 68,3% [4, с. 11].

Станоўчая дынаміка была звязана з агульным эканамічным пад'ёмам, які адбываўся ў спрыяльных умовах зніжэння ваенных расходаў, росту прадукцыйнасці працы і высокай патрэбы ў рабочай сіле, асабліва ў ніжняй шкале аплаты працы. Былі зменшаны расходы на ўтрыманне дзяржаўнага апарату, павялічана мінімальная заработная плата, уведзены элементы прагрэсіўнага падаткаабкладання ў выглядзе павелічэння верхняй стаўкі падаходнага падатку да 39,6% [5, с. 3–15; 6, с. 61].

Тым не менш фундаментальных змяненняў у панаваўшых у 70-х – першай палове 90-х гг. тэндэнцыях не адбылося і ў другой палове 90-х гг. Разрыў паміж заработнай платай высокааплатных катэгорый работнікаў і ўсімі астатнімі працягваў нарастаць. Нягледзячы на рост заработнай платы з 1995 г., сярэдні ўзровень пагадзіннай аплаты працы 1979 г. быў дасягнуты толькі ў 1997 г. У 2000 г. сярэдняя заработная плата мужчын была ўсё яшчэ ніжэй, чым у 1979 г. На карысць карпарацый нарастаў разрыў паміж ростам прадукцыйнасці і ўзроўнем кампенсацыі працы. Працягвала расці колькасць адпрацаванага амерыканцамі часу. Рост сацыяльнай няроўнасці запаволіўся, але не спыніўся [4, с. 5]. Прычыны эканамічнай экспансіі былі звязаны не столькі з прынятымі палітычнымі рашэннямі ці рэалізацыяй эканамічнай стратэгіі, колькі з выкарыстаннем вынікаў аб'ектыўнага працэсу пераходу краіны ў постіндустрыяльную, інфармацыйную стадыю развіцця. У 90-я гг. былі рэалізаваны перавагі, звязаныя з выкарыстанем патэнцыялу сярэдняга класа як кваліфікаванай рабочай сілы.

*Табліца* – **Сярэднегадавы рост эканомікі «краін вялікай сямёркі» ў 1990-2000 гг. [1, с. 186]**

| Краіна | Рост валавага нацыянальнага прадукту | Рост вытворчасці тавараў і паслуг на душу насельніцтва |
|---|---|---|
| Канада | 2,7 % | 1,6 % |
| Францыя | 1,8 % | 1,4 % |
| Германія | 1,5 % | 1,3 % |
| Італія | 1,6 % | 1,7 % |
| Японія | 1,4 % | 1,1 % |
| Вялікабрытанія | 2,2 % | 2,0 % |
| ЗША | 3,3 % | 2,3 % |

Па даных Бюро эканамічнага аналізу міністэрства гандлю ЗША, пры росце эканомкі ў другой палове 90-х гг. тэмпам у 4,1% 1,2% забяспечваліся за кошт яе інфармацыйнай складальнай [7, с. 71]. У новых умовах чым далей, тым больш праяўляліся доўгачасовыя інвестыцыі ў адукацыю, у веды, у чалавека, у сярэдні клас. Па аб'ёме гэтых інвестыцый ЗША не мелі сабе роўных. Рэалізацыя гэтай перавагі забяспечыла краіне ролю сусветнага тэхналагічнага лідэра, прывяла, у выніку, да росту замежных інвестыцый, росту кошту акцый амерыканскіх кампаній. З 1994 па 2000 г. індэкс Доу-Джонса павысіўся больш чым у 4 разы [8, с. 30–32].

Выніковы эканамічны даклад прэзідэнта Б. Клінтана ў студзені 2001 г. канстатаваў рост у параўнанні з перыядам 1973–1995 гг. больш чым у 2 разы прадукцыйнасці працы, нізкі ўзро-

вень беспрацоўя і інфляцыі, ліквідацыю дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту і больш хуткія, у параўнанні з іншымі развітымі краінамі, тэмпы росту даходаў насельніцтва [9, с. 19–23].

У канцы даклада, аднак, адзначалася, што рэальнай пагрозай для далейшага паспяховага развіцця можа стаць адмова ад строгай фінансавай палітыкі і скарачэнне падаткаў на абмежаванае кола падаткаплацельшчыкаў, што перашкодзіць доўгачасовым інвестыцыям у «чалавечы капітал», эканоміку краіны ў цэлым [9, с. 247]. Падзеі, якія адбыліся пасля гэтага, пацвердзілі названыя асцярогі.

Эканамічная сітуацыя ў першы перыяд праўлення адміністрацыі Дж. Буша-малодшага характарызавалася рысамі, якія гаварылі, з аднаго боку, аб цыклічнасці эканамічнага развіцця, з другога – аб тым, што з прычыны розных абставін абвастрыліся праблемы, рашэнне якіх уяўлялася бліжэйшай перспектывай у перыяд клінтанаўскіх адміністрацый. Валавы нацыянальны прадукт з 2001 па 2004 г. вырас з 9875 млрд дол. да 10784 млрд дол., прырост склаў 2,6 % у год, што было адносна невысокім паказчыкам і меншым, чым у часы крызіснага перыяду праўлення Дж. Картэра. Калі ў 2000 г. краіна мела прафіцыт дзяржаўнага бюджэту ў 236 млрд дол., то к 2004 г. дэфіцыт склаў 422 млрд. Розніца паказчыкаў склала 658 млрд [6, с. 70]. Гандлёвы дэфіцыт у 2004 г. дасягнуў 650 млрд дол. Прычынай таму, у прыватнасці, быў працякаючы працэс замяшчэння амерыканскіх тавараў – аўтамабіляў, грузавікоў, хатняй электронікі, камп'ютэрнай тэхнікі – еўрапейскімі і азіяцкімі аналагамі. У краіне больш не выраблялiся свае тэлевізары. Станоўчы баланс захоўваўся ў галіне авіяцыйнай прамысловасці, аднак з прычыны растучай канкурэнцыі з боку еўрапейскіх кампаній і тут прыбыткі амерыканскіх кампаній скараціліся. Парадаксальнасць сітуацыі заключалася ў тым, што ў найвялікшай прамысловай дзяржаве свету станоўчую прыбаўку ў баланс знешняга гандлю, акрамя паставак авіяцыі, давалі па меры іх значнасці экспарт соі, кукурузы, пшаніцы, кармоў, шэрсці, мяса, чыгуну, рысу, друкаванай прадукцыі, вугалю, тытунёвай прадукцыі, угнаенняў, шкла [10]. Працягваў расці дзяржаўны доўг. Тэндэнцыя да зніжэння дзяржаўных расходаў у 90-я гг. не атрымала свайго працягу ў пачатку стагоддзя. Прычынамі таму сталі павелічэнне асігнаванняў на абарону пасля 11 верасня 2001 г., дадатковыя расходы на барацьбу з наступствамі прыродных катаклізмаў у 2004 і 2005 гг., павелічэнне дыскрэтных расходаў бюджэту, абароненыя расходныя артыкулы бюджэту, рост працэнтных ставак па дзяржаўных каштоўных паперах [6, с. 75].

Цэнтральнай тэмай прэзідэнцкіх выбараў 2000 г. была падаткавая рэформа. Абодва кандыдаты, А. Гор і Дж. Буш-малодшы, падтрымалі прапановы аб зніжэнні падаткаў. Падчас перадвыбарчай дыскусіі адзначаліся такія недахопы існаваўшай сістэмы, як гістарычна найбольшы ўзровень падаткаў, выплачваемых сярэднім класам, які перашкаджаў новым капіталаўкладанням, высокі падатак на прырост капіталу, высокі падатак на спадчыну, які перашкаджаў развіццю малога і сярэдняга бізнесу, недасканаласць Падаткавага кодэкса краіны ў цэлым [11, с. 37; 6, с. 62–63]. Ідэалагічнае абгрунтаванне падаткавай рэформы кандыдата-пераможцы засноўвалася на скарачэнні падаткавых ставак усіх відаў у інтарэсах сярэдняга класа, што лічылася лёгка ажыццявімым з прычыны меўшагася прафіцыту дзяржаўнага бюджэту.

Дж. Буш прапанаваў агульнае для ўсіх, уключаючы багатую частку насельніцтва, зніжэнне ўзроўню падаткаў, павелічэнне ў 2 разы падаткавых скідак на дзяцей і дэпазітныя рахункі на іх адукацыю. Адказваючы на абвінавачванні ў тым, што найбольшую выгаду ад агульнага зніжэння ўзроўню падаткаў атрымліваюць багатыя амерыканцы, ён падкрэсліваў, што гэта будзе выгадна для ўсіх, а сярэдняя амерыканская сям'я атрымае дадатковыя сродкі ў памеры 1600 дол. у год. Зніжэнне падаткаў у 500 млрд дол. прапаноўвалася і А. Горам, і дэмакратамі ў Кангрэсе (900 млрд), але без зніжэння падаткаў для груп з высокімі даходамі. 26 мая 2001 г. Кангрэс адобрыў прапанаваную прэзідэнтам праграму зніжэння падаткаў на 1350 млрд дол. на працягу 10 гадоў. У гэтым рашэнні рэспубліканцаў падтрымалі 37 дэмакратаў у Палаце прадстаўнікоў і 12 у Сенаце [12].

Рэформа падаткаабкладання стала краевугольным каменем прэзідэнцтва Дж. Буша-малодшага. Яна прадугледжвала 10-працэнтнае зніжэнне падаткаў на першыя 6 тыс. долараў даходу для адзінокіх і 12 тыс. дол. для знаходзіўшыхся ў шлюбе амерыканцаў. Усе іншыя гранічныя стаўкі падаходнага падатку зніжаліся на 1% з 1 ліпеня 2001 г. і далей зніжаліся паступова да ўзроўню ў 35, 33, 28, 25, 15 і 10% у 2006 г. Падаткавыя льготы павялічваліся на 100 дол. і далей павінны былі расці паступова пачынаючы з 2005 г., дасягнуўшы 1 тыс. дол. у 2010 г. Падатак на спадчыну планавалася не мяняць да 2010 г. Даходы бюджэту ўразаліся на 100 млрд. дол. Гэта пагражала сацыяльным праграмам. Але чакаўся рост даходаў у 5,6 трлн, з якіх 2,8 трлн павінна было пайсці на змяншэнне дзяржаўнага доўгу, 1,3 трлн – на скарачэнне падаткаў, а астатнія 1,5 трлн – на расходы. У 2003 г. Кангрэс паскорыў прымяненне большасці пала-

жэнняў рэформы 2001 г. Некаторыя з іх – павелічэнне падаткавых ільгот на дзяцей да 1 тыс. дол., скарачэнне падаткаў на сямейных амерыканцаў – павінны былі спыніць сваё дзеянне, але яно было працягнута. У апошні момант было прынята рашэнне прадоўжыць дзеянне палажэння аб зніжэнні падаткаў на карпарацыі на 113 млрд дол. Усё гэта азначала страты бюджэту за 10 гадоў у 148 млрд дол., а беручы пад увагу значныя працэнты па дзяржаўным доўгу, – у 211 млрд.

Якія былі вынікі рэформы падаткавай сістэмы? Скарачэнне падаткаў, фінансавая палітыка адміністрацыі не прывялі да чакаўшайся папраўкі эканомікі пасля рэцэсіі 2000–2001 гг. Зніжэнне гранічных ставак падаходнага падатку, зніжэнне агульнай падаткавай нагрузкі, відаць, пазітыўна адбіліся на павелічэнні інвестыцый, дынамікі вытворчасці, росце валавога ўнутранага прадукту, росце занятасці, росце прадукцыйнасці працы. Усярэдненыя паказчыкі сведчылі аб росце індывідуальнага спажывання і ўзроўні грашовага даходу на душу насельніцтва [6, с. 66–69]. Аднак у жніўні 2004 г. Бюджэтны камітэт Кангрэса прыйшоў да высновы, што рэформы падаткаабкладання праводзіліся адміністрацыяй на карысць багатай часткі насельніцтва. Трэцяя частка сумы скарочаных падаткаў дасталася 1% самых багатых амерыканцаў з сярэднім даходам у 1,1 млн дол. [13]. Даследаванні Цэнтра вывучэння падаткавай палітыкі аўтарытэтнага Бруклінскага інстытута паказалі, што ў 2005 г. сярэдні дадатковы даход сем'яў, якія належалі да трэцяй квінты, трэцім па ўзроўні даходаў 20% амерыканцаў павінен быў скласці толькі 162 дол., у той час як самыя багатыя 20% амерыканцаў атрымлівалі прыбаўку да сваіх даходаў у памеры 1317 дол., а хатнія гаспадаркі з узроўнем даходаў ад 200 тыс. да 500 тыс. дол. – 2390 дол. у год [14]. Рост занятасці і заработнай платы не кампенсавалі страт сярэдняга класа ў выніку росту кошту медыцынскага абслугоўвання ці росту кошту паліва. У канцы мая 2004 г. сярэдні кошт аднаго галона бензіну складаў 2,1 дол. Па даных журнала «Форчэн», павышэнне цэн на бензін з пачатку года каштавала амерыканскім спажыўцам 35 млрд дол., што было ў 2 разы больш за суму падаткавых ільгот ад падаткавай рэформы Дж. Буша. Па даных даследавання Нацыянальнай гандлёвай федэрацыі, не менш чым 20% сем'яў з даходам менш чым 500 тыс. дол. у год скарацілі свае расходы на харчаванне ў сувязі з ростам кошту паліва. Больш за 25% сем'яў сталі менш карыстацца аўтамабілем, 15% сталі купляць менш адзення. Захоўвалася ўстойлівая тэндэнцыя да зніжэння індывідуальных накапленняў [15].

У першы тэрмін прэзідэнцтва сацыяльныя расходы і перш за ўсё расходы на адукацыю і ахову здароўя, выраслі на 36 %, што было істотна больш, чым у гады папярэдняга праўлення дэмакратаў [16, с. 5]. На фоне дэфіцытнага фінансавання і растучых ваенных расходаў прадоўжыць далей такую палітыку аказалася немагчымым. Альтэрнатывай магло быць або зніжэнне дзяржаўных расходаў, або павышэнне падаткаў. У 2005 г. у якасці вымушанай меры прэзідэнт прапанаваў скарачэнне 150 сацыяльных праграм, з якіх 89 былі скарочаны. Упершыню пасля Рэйгана прэзідэнт прапанаваў скараціць расходы на сацыяльныя патрэбы [17, с. 19–20]. Вясной 2005 г. Кангрэс адобрыў прапанову аб скарачэнні сацыяльных праграм для маламаёмных слаёў насельніцтва ў памеры 30,5 млрд дол. [18, с. 1–2]. Амаль палова зэканомленых у 2006 г. сродкаў прыходзілася на ўрэзанае фінансаванне Міністэрства адукацыі і праграмы падтрымкі пачатковай і сярэдняй адукацыі. Скарачалася фінансаванне праграм барацьбы са злачыннасцю, аховы навакольнага асяроддзя, падтрымкі фермерскіх гаспадарак і іншых праграм. Пры гэтым расходы на абарону краіны і барацьбу з тэрарызмам узрасталі [19, с. 3–4]. На 2007 г. былі намечаны дадатковыя скарачэнні яшчэ 141 праграмы. Расходы на праграму медыцынскага абслугоўвання пенсіянераў намячалася скараціць на 36 млрд дол. к 2011 г. і на 105 млрд к 2016 г. [20, с. А01].

З пачаткам другога тэрміну прэзідэнцтва была разгорнута шырокамаштабная кампанія прапаганды рэформы сістэмы сацыяльнага забеспячэння, якой ужо ў бліжэйшай будучыні пагражае дэфіцытнае фінансаванне і якая нібыта ўжо з'яўлялася прычынай дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту. Апошняе не адпавядала рэчаіснасці, фінансаванне сістэмы заставалася прафіцытным. Праблема фінансавання сацыяльнага забеспячэння, аднак, сапраўды існавала. Уведзены ў 1977 г. прынцып індэксацыі пенсій у спалучэнні з дэмаграфічнымі наступствамі старэння насельніцтва павінен быў, на думку многіх эканамістаў, прывесці да банкруцтва дзяржаўных фондаў сацыяльнага страхавання к сярэдзіне XXI ст. У якасці лекаў ад маючай адбыцца эканамічнай катастрофы прапаноўвалася, з аднаго боку, адмовіцца ад прынцыпу індэксацыі пенсій, з другога – развіваць працэс адкрыцця індывідуальных пенсіённых рахункаў. Замарожванне дзяржаўных падаткаў на сацыяльнае забеспячэнне, па сутнасці, азначала б паступовую ліквідацыю самой сістэмы і пераход да становішча, калі не дзяржава, а сам работнік планаваў бы сваю пенсію, браў на сябе ўсе рызыкі па яе забеспячэнні. Нельга не адзначыць, што параў-

нанне стану спраў у ЗША і іншых краінах Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця паказвае, што па ўзроўні падаткавых адлічэнняў у фонды сацыяльнага забеспячэння краіна ў 2003 г. займала 18 месца, а па ўзроўні сукупнай падаткавай нагрузкі займала перадапошняе месца з 30 найбольш развітых краін. Адпаведна, як адзначала расійскі даследчык Н.М. Траўкіна, існавала рэальная магчымасць павышэння падаткавай нагрузкі пры захаванні паспяховага эканамічнага развіцця. Аб падтрымцы менавіта такога курсу сведчылі і вынікі сацыялагічных апытанняў амерыканцаў, якія разумелі неабходнасць павелічэння падаткаў, перш за ўсё на даходы карпарацый [19, с. 14–17].

Выбары ў Кангрэс 2006 г. прынеслі пераканаўчую перамогу дэмакратам. Значную ролю ў гэтым адыграла тое, што, нягледзячы на ўпэўнены рост амерыканскай эканомікі, «…большинство американцев в незначительной степени ощущает результаты этого роста… для средней американской семьи экономия, полученная от сокращения налогов, не компенсирует расходов на жилье, образование и особенно на медицинские услуги, которые увеличиваются высокими темпами, несмотря на низкий в целом уровень инфляции» [16, с. 12]. У студзені 2007 г. член сенацкага бюджэтнага камітэта Б. Сандэрс адзначаў, што за час праўлення Дж. Буша-малодшага ў 5,4 млн прадстаўнікоў сярэдняга класа даходы сталі ніжэй афіцыйнага ўзроўню беднасці, 6,8 млн амерыканцаў страцілі медыцынскую страхоўку, 3 млн прамысловых рабочых згубілі працу, а сярэдні даход працючых сем'яў зніжаўся на працягу апошніх 5 гадоў [21].

Палітычны поспех Дж. Буша-малодшага на прэзідэнцкіх выбарах забяспечваўся падтрымкай сярэдняга класа, яго кампетэнтнай часткай у пытаннях аб маральных каштоўнасцях, тэрарыстычнай пагрозе і зніжэнні падаткаў [16, с. 3–4]. Але метады рашэння ўзнікаўшых праблем, накіраванасць палітыкі кіруючай адміністрацыі выклікалі абгрунтаваныя асцярогі растучай колькасці амерыканцаў. Прапанаваная прыватызацыя пенсіённай сістэмы не сустрэла падтрымкі большасці амерыканцаў. Высокі рэйтынг прэзідэнцтва пасля першых поспехаў ваеннай кампаніі супраць Іракa не змяніў агульнай карціны падзення даверу да адміністрацыі. Сваю ролю ў гэтым адыгралі крайне неэфектыўныя дзеянні адміністрацыі ва ўмовах буйнейшай прыроднай катастрофы, што абрушылася на краіну, – урагану «Катрына», недафінансаванне прыродаахоўных мерапрыемстваў у сувязі з ростам расходаў на вайну з міжнародным тэрарызмам, вайну ў Іраку. Чым далей, тым больш нарастаў раскол у грамадстве ў сувязі з ацэнкай знешняй палітыкі прэзідэнта. Спробы аб'яднаць нацыю пад сцягам барацьбы з міжнародным тэрарызмам праваліліся на фоне катастрафічных наступстваў вайны ў Іраку.

Бюджэтныя прапановы прэзідэнта 2007 г. утрымлівалі далейшыя скарачэнні сацыяльных расходаў пры рэкордных у 481 млрд дол. расходах на абарону. Адначасова дэкларавалася мэта ліквідацыі дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту к 2011 г. Да таго ж к 2011 г. першая хваля пакалення «бэбі буму» (амерыканцаў, якія нарадзіліся паміж 1946 і 1964 гг., – больш за 75 млн чалавек) будзе мець права на атрыманне медыцынскай дапамогі па праграме Медыкэр, што дапаможа прывесці да крызісу ўсёй сістэмы сацыяльнага забеспячэння. Прапановы прэзідэнта Буша ўтрымлівалі ўвядзенне дыферэнцыраванага падыходу ў залежнасці ад узроўню дабрабыту пенсіянераў, ліквідацыю падаткавых ільгот у адносінах да страхавых полісаў, якія прадастаўляліся работадаўцам, коштам больш за 15 тыс. дол. З прычыны хуткага росту кошту медыцынскага абслугоўвання апошняя мера пагражала стратай пенсіённых бенефіцый не толькі заможнай, але і асноўнай частцы пенсіянераў – прадстаўнікоў сярэдняга класа [22, с. 2–3].

Такім чынам, тэндэнцыі, што вызначалі ход сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 70–90-я гг. XX ст., напрамак і змест працэсаў, якія выявілі становішча сярэдняга класа і іншых сацыяльных груп, захаваліся і ў пачатку XXI ст. Гэта дае падставу сцвярджаць, што палітыка той ці іншай кіруючай адміністрацыі з'яўлялася важным, але не адзіным, што уплываў на становішча сярэдняга класа, фактарам. Гаворка ідзе аб доўгачасовых тэндэнцыях, рэальныя праявы, якіх маглі ўзмацняцца ці рэгулявацца практыка-палітычнымі дзеяннямі кіраваўшых адміністрацый, але не маглі імі цалкам пераадольвацца.

*Літаратура і крыніцы*


1. *Burtless, G.* Has Widening Inequality Promoted or Retarded US Growth? / G. Burtless // Canadian Public Policy. – 2003. – № 21.
2. *Mishel, L., Bernstein, J., Boushey, H.* State of working America / L. Mishel, J. Bernstein, H. Boushey. – Washington: The Economic Policy Institute, 2003.
3. *Лебедева, Л.Ф.* Государственная политика защиты населения США / Л.Ф. Лебедева // США * Канада: ЭПК. – 2005. – № 2. – С. 17–32.
4. *Mishel, L., Bernstein, J., Allegretto, S.* The state of working America. 2004/2005 / L. Mishel, J. Bernstein, S. Allegretto. – Ithaca, NY: Cornell University Press, 2005.
5. *Рогов, С. М.* Администрация Клинтона: подводить итоги еще рано / С.М. Рогов // США * Канада: ЭПК – США. – 2000. – № 2. – С. 3–15.

6. *Бабич, С.Н.* Экономические аспекты налоговой реформы президента Буша / С.Н. Бабич // США * Канада: ЭПК. – 2006. – № 10. – С. 60–79.
7. Государственная экономическая политика США: современные тенденции / отв. ред. В.Б. Супян; РАН. Ин-т США и Канады. – М.: Наука, 2002. – 348 с.
8. *Иноземцев, В.Л.* Технологический прогресс и социальная поляризация в XXI столетии / В.Л. Иноземцев // Политические исследования. – 2000. – № 6. – С. 28–39.
9. Economic report of the President // [Electronic resource]. – The White House, 2001. – Mode of access: <http://www.gpoaccess.gov/eop/download.html> – Date of access: 15.05.2003.
10. *Wooldridge, F.* America for sale: the destruction of the middle class / F. Wooldridge // Washington Dispatch [Electronic resource]. – 2004. – March 31. – Mode of access: <http://www.itpaa.org//modules.php?name=News&file=print&sid=401> – Date of access: 27.08.2006.
11. *Золотухин, В.П.* Позиции А. Гора и Дж. Буша по актуальным проблемам / В.П. Золотухин // США * Канада: ЭПК. – 2000. – № 9. – С. 2–17.
12. *Lynch, M.W.* Check's in the mail – analysis of George W. Bush tax cut / M.W. Lynch // Reason <http://articles.findarticles.com/p/articles/mi_m1568> [Electronic resource]. – 2001 <http://articles.findarticles.com/p/articles/mi_m1568/is_4_33>. – August. Mode of access: <http://articles.findrticles.com/p/articles/mi_m1568/is_4_33> – Date of access: 3.05.2005.
13. *Miller, G.A.* The middle class squeeze. America's growing inequality problem / G.A. Miller // [Electronic resource]. – Mode of access: <http://www.house.gov/georgemiller/middleclass/middleclass.html> – Date of access: 7.07.2005.
14. *Greenstein <http://www.cbpp.org/staff.html>*, R., Shapiro, I. Many middle-class families likely will wind up as net loses from the «middle-class» / R. Greenstein <http://www.cbpp.org/staff.html>, I. Shapiro // Tax Cut Legislation [Electronic resource]. 2004. – Mode of access: www.cbpp.org/9-21-04tax.htm <http://www.cbpp.org/9-21-04tax.htm> – Date of access: 27.11.2006.
15. *Miller, G.A.* Prices at the pump: The Bush Gas «Tax» / G.A. Miller // [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.house.gov/georgemiller/middleclass/.html – Date of access: 7.07.2005.
16. *Рогов, С.М.* Вторая администрация Джорджа Буша-младшего / С.М. Рогов // США * Канада: ЭПК. – № 2. – С. 3–30, № 3. – С. 3–32.
17. Budget of the United States government, fiscal year 2006 // Executive Office of the President, Office of Management and Budget [Electronic resource]. – 2005 – Mode of access: http://www.gpoaccess.gov/usbudget/fy06/pdf/budget/budget.zip. – Date of access: 3.02.2007.
18. *Horney, J.* Assessing the conference agreement on the budget resolution / J. Horney. – Washington: Center of Budget and Policy Priorities, 2005. – 25 p.
19. *Травкина, Н.М.* Внутренняя политика Дж. У. Буша: некоторые особенности / Н. М. Травкина // США * Канада: ЭПК. – 2005. – № 10. – С. 3–20.
20. *Goldstein, A.* 2007 budget favors defense Medicare takes biggest hit in $2.7 trillion plan / A. Goldstein // Washington Post. – 2006. – February 5.
21. *Sanders, B.* A budget for the middle class / B. Sanders // Mother Jones [Electronic resource]. – 2007. – January 30. – Mode of access: <http://www.motherjones.com/news/update/2007/01/sanders_oped.html> – Date of reading: 2/02/2007.
22. *Daniel, C., Guha, K.* Bush wants to means-test middle-class benefits / C. Daniel, K. Guha // The Financial Times. – 2007. – February 5. – P. 2-3.

Summary

*The article is devoted to the analyses of the substance and most significant outcomes of the Clinton's and the Bush's social policy. The author comes to the conclusion that in spite of existing differences long term tendencies – social differentiation and middle class erosion are preserved and persist.*

---

*УДК 943.085«1932»*

***А.Г. Субоцін***

# «УДАР ПА ПРУСІІ». ДА ГІСТОРЫІ ІМПЕРСКАЙ ЭКЗЕКУЦЫІ 20 ЛІПЕНЯ 1932 г. У ГЕРМАНІІ

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў падзеі 20 ліпеня 1932 г., вядомыя ў нямецкай гістарыяграфіі як «Удар па Прусіі» (Preussenschlag), не раз знаходзіліся ў фокусе навуковай дыскусіі гісторыкаў і правазнаўцаў. Сваёй палітыкай у Прусіі, названай Й.К. Пойкертам «генеральнай рэпетыцыяй дзяржаўнага перавароту ў Германіі», рэйх паклаў пачатак працэсу паступальнага разбурэння асноў веймарскага канстытуцыйнага ладу і «выпустошванню сутнасці нямецкай федэратыўнай ідэі» [1]. Сярод прац замежных аўтараў, прысвечаных гісторыі прускай экзекуцыі, асаблівай увагі заслугоўваюць манаграфіі Г. Шульца «Между демократией и диктатурой», М. Геймерса «Унитаризм и южно-германское самосознание», С. Отэра «Интеграция и субсидиарность в немецком федеративном государстве» і Э. Відэра «Рейх и Пруссия». Абапіраючыся на аналіз шырокага кола крыніц, яны даюць нагляднае ўяўленне аб прычынна-выніковых сувязях і змесце ліпеньскіх падзей 1932 г., закранаюць праблему іх палітыка-